УДК 2

# "РЭЛІГІЙНЫ МІР" УЛАДЫСЛАВА IV ВАЗЫ Ў КАНТЭКСЦЕ РАЗВІЦЦЯ АДУКАЦЫІ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў 1632–1648 гг.

**Самусік Андрэй Фёдаравіч,**
Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт
(г. Мінск, Беларусь)

*У артыкуле аналізуюцца змены, якія адбыліся ў праваслаўнай, пратэстанцкай і каталіцкай адукацыі ў час праўлення караля Уладыслава IV Вазы. Адзначаецца дваістасць яго кафесійнай палітыкі, выкліканая неабходнасцю ўлічваць інтарэсы каталіцкай большасці правячай эліты. Прыводзіцца інфармацыя аб гісторыі асобных навучальных устаноў у тагачаснай Беларусі.*

8 лістапада 1632 г. на элекцыйным сойме ў Варшаве новым каралём Рэчы Паспалітай быў абраны Уладыслаў IV Ваза. Ён імкнуўся праводзіць актыўную



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

знешнюю палітыку, а таму дзеля кансалідацыі грамадства ўзяў курс на “рэлігійны мір”. Разам з тым, апошні немагчыма было дасягнуць не задаволіўшы адукацыйныя патрэбы асобных канфесій.

Найперш гэта датычылася праваслаўнай царквы, якая адчувала моцны ціск з боку каталікоў і уніятаў. Яшчэ да свайго абрання – 1 лістапада 1632 г. будучы кароль падпісаў “Статьи для успокоения православной религии”, юрыдычна легалізаваўшыя праваслаўную царкву ў Рэчы Паспалітай. Акрамя іншага праваслаўным было дазволена ўтрыманне і збудаванне семінарый, школ, друкарань ды стварэнне новых брацтваў. Адпаведна ім на каранацыйным сойме ў Кракаве ў лютым-сакавіку 1633 г. новым манархам быў выдадзены цэлы шэраг прывілееў пацвердзіўшых дзейнасць асобных брацкіх школ. Так, 3 сакавіка мяшчанам Магілёва і Пінска было дазволена: “Школы наук вызволенных языков вшеляких мети…” [1, с. 58]. 18 сакавіка ён падпісаў прывілей Віленскаму брацтву, дзе між іншым адзначалася: “Детей брати вписное народу христианского и убогих сирот в школе их братской дармо учити…” [2, с. 119-125]. У гэты ж дзень і мінскія братчыкі атрымалі права на: “Школу для науки людей хрестиянских и деток их” [3, с. 132]. 12 ліпеня 1633 г. Полацкай Богаяўленскай царкве Уладыслаў IV Ваза выдаў прывілей на “збудаванье школы для науки детем христианским” [4, с. 138-141]. Падпісваў падобныя дакументы кароль і ў далейшым – 13 кастрычніка 1641 г. мяшчане Брэста атрымалі ад яго дазвол пры царкве Раства Багародзіцы: “Школу языка руского и польского… мети” [5, от. 73].

Пры гэтым, аднак, палітыка верацярпімасці Уладыслава IV Вазы не заўсёды знаходзіла падтрымку ў правячых колах Рэчы Паспалітай, якая па-ранейшаму ў большасці заставалася каталіцкага веравызнання. Так, з-за супрацьдзеяння вялікага канцлера кароннага Я. Жадзіка і падканцлера кароннага Ф. Замойскага Кіева-Магілянскі калегіўм у 1633 г. не атрымаў афіцыйнага статуса акадэміі. А 14 сакавіка 1635 г. на сейме ў Варшаве кароль увогуле выдаў асобнае распараджэнне: “У школах Кіеўскіх і Віленскіх неўнітам па-грэчаскі і па-латыні вучыць дазваляем, такім чынам, каб засваенне гуманіёры не ішло далей дыялектыцы і логіцы”, што цалкам спыняла працэс іх далейшага развіцця ды пераўтварэння ў вышэйшыя навучальныя ўстановы [6, арк. 1]. У гэты ж дзень ім быў падпісаны дакумент аб размежаванні ўніяцкіх і праваслаўных храмаў ды манастыроў. Сярод іншага тут гаварылася, што: “В Витебске же, в Полотске и в Новогородке неунияты никогда не должны будут иметь никакой церкви” [7, с. 207-208].

Падобнай дваістасцю была прасякнута палітыка Ўладыслава IV Вазы і ў дачыненні да прыхільнікаў Рэфармацыі. Так, дзякуючы хадайніцтву свайго асабістага ўрача лютэраніна М. Форбек-Летава (родам з Вільні), кароль 20 ліпеня 1633 г. выдаў прывілей з пацверджаннем правоў пратэстантаў у сталіцы ВКЛ. Акрамя іншага тут меліся палажэнні, дазваляўшыя ім займацца асветніцкай дзейнасцю – маглі ўтрымліваць “містраў школьных”, а іх вучылішчныя будынкі вызваляліся ад пастояў [8, арк. 67-68 адв.]. Азначаны ўчынак, аднак, зусім не азначаў падтрымку прыхільнікаў Рэфармацыі з боку манарха ў выпадку нейкіх канфліктаў з каталікамі. Найбольш вядомы з іх адбыўся якраз у Вільні. 4 кастрычніка 1639 г. выхаванец кальвіністаў П. Пекарскі разам са сваім слугою Ю. Ракоўскім, страляючы з лука па птушках, трапілі стрэламі ў абраз Архангела Міхаіла на франтоне касцёла кляштара бернардынак. З гэтай нагоды



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ў горадзе адбыліся сапраўдныя хваляванні, ініцыятарамі якіх сталі езуіты. Яны абвінавацілі пратэстантаў ў зняважанні каталіцкіх святынь. Вынікам судовых разбіральніцтваў стала забарона ў 1640 г. кальвіністам у Вільні ажыццяўляць набажэнства і займацца асветніцкай дзейнасцю (гімназічны будынак быў знесены) [9, с. 90-101].

Разам з тым і свавольствы езуіцкай вучнёўскай моладзі выклікалі агульнае незадавальненне. Нават Уладыслаў IV Ваза страціў давер да езуітаў і загадаў не прымаць іх пры сваім двары. Адначасова, з гэтым кароль у 1641 г. запрасіў у краіну прадстаўнікоў іншага каталіцкага манаскага ордэну – піяраў, якіх у Заходняй Еўропе разглядалі ў якасці альтэрнатывы езуітам у школьнай справе. Першыя манахі прыбылі ў Польшчу ў 1642 г. з захопленага ў час Трыццацігадовай вайны шведскімі войскамі Аламюца ў Сілезіі і праз год адкрылі вучылішча ў Падалінцы непадалёк ад мяжы з Венгрыяй (на тэрыторыі ВКЛ яны з'явіліся ў канцы XVII ст.) [10, с. 750-751].

Неабходна, аднак, адзначыць, што запрашэнне піяраў зусім не азначала, што Ўладыслаў IV Ваза збіраўся цалкам замяніць імі езуітаў. Апошнія пры ім працягвалі ўмацоўваць свае становішча ў сферы адукацыі. Так, у 1633 г. ён адобрыў ініцыятыву канцлера ВКЛ кн. А.С. Радзівіла па адкрыццю езуіцкага калегіўма ў Пінску – старадаўнім цэнтры праваслаўя на Палессі (сейм пацвердзіў яго фундуш у 1635 г.) [11, с. 330-333]. Разам з тым, кароль спадзяваўся, што пры ўзмацненні канкурэнцыі ў школьнай справе, езуіты пачнуць працэс мадэрнізацыі ўласных вучэбных праграм. Дзеля гэтай жа мэты 11 кастрычніка 1641 г. ён выдаў прывілей, згодна якому пры Віленскай езуіцкай акадэміі ствараўся юрыдычны факультэт з кафедрамі цывільнага (рымскага) і кананічнага права [12, с. 461-463].

У цэлым, не выклікае сумненняў, што Ўладыслаў IV Ваза сапраўды імкнуўся дасягнуць у краіне "рэлігійнага міру", што паўплывала і на развіццё адукацыі ў Беларусі. Двaістасць дадзенай палітыкі тлумачыцца перавагай каталікоў у магнацка-шляхецкім асяроддзі. Нягледзячы, аднак, на гэта менавіта дзякуючы яму была захавана праваслаўная сістэма асветы, а запрашэнне піяраў заклала падмурак для далейшай мадэрнізацыі ўсёй школьнай справы ў Рэчы Паспалітай.

## Літаратура


1. Самусік, А.Ф. Спецыфіка выкладання "septem artes liberalis" у айчынных брацкіх школах у канцы XVI – першай трэці XVII ст. / А.Ф. Самусік // Вышэйшая школа. – 2016. – № 2. – С. 57–60.
2. Собрание древних грамот и актов городов : Вильны, Ковна, Трок, православных монастырей, церквей и по разным предметам : в 2 ч. – Вильно : Тип. А. Марциновского, 1843. – Ч. 2. – 208 с.
3. Беларускі Архіў : у 3 т. / пад рэд. Д.І. Даўгялы. – Менск : Выд. Бел. Акадэміі Навук, 1927-1931. – Т. 3. – Вып. 1. – 1931. – 341 с.
4. Витебская старина : в 5 т. / сост. А.П. Сапунов. – Витебск : Тип. Губерн. правления, 1883-1888. – Т. 5. – Ч. 1. – 1888. – CLXVII, 650 с.
5. Диариуш Берестейского игумена Афанасия Филиповича, 1646 г. // Русская историческая библиотека, издаваемая Археографической комиссией : в 39 т. – СПб ; Ленинград, 1872–1927. – Т. 4. – Кн. 1. – СПб. : Тип. А. Траншкля, 1878. – Ст. 49-156.
6. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (РДГА). – Ф. 823. Воп. 1. Спр. 656.
7. Уния в документах / сост. В.А. Теплова [и др.]. – Минск : Лучи Софии, 1997 г. – 520 с.
8. Літоўская нацыянальная бібліятэка імя М. Мажвідаса. Аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў (ЛНБММ АРКіР). – Ф. 93. Спр. 1. Арк. 67 адв.
9. Wisner, H. Likwidacja zboru ewangelickiego w Wilnie / H. Wisner // Odrodzenie i Reformacja w Polsce. – 1993. – T. 37. – S. 89-102.
10. Biegański, S. Szkoły pijarskie w Polsce / S. Biegański // Muzeum. – 1897. – № 11. – S. 749–754.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

11. Rostowski, S. Lithuanicarum Societatis Jesu historiarum provincialium / S. Rostowski. – Vilnae : Druk. Akademicka, 1768. – VI, 515 p.
12. Baliński, M. Dawna Akademia Wileńska : próba jéj historyi / M. Baliński. – Poznań : Nakł. i druk. J. Ohryzki, 1862. – XI, 606 s.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова